# ПРАВАПІС СКЛАДАНЫХ НАЗОЎНІКАЎ ІТ-ТЭМАТЫКІ

*Макушынская Д.У.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Албут А.А. – старшы выкладчык*

Разгледжаны правапіс складаных тэрмінаў ІТ-галіны на прыкладзе тэрмінаў *бэкэнд-распрацоўшчык* і *смарт-прылада.* Вынікі даследавання могуць быць карысныя пры вырашэнні цяжкасцей, якія могуць узнікнуць пры напісанні падобных складаных назоўнікаў.

Сучаснае грамадства працягвае развівацца з неверагоднай хуткасцю. Новыя тэхналогіі ўвесь час з'яўляюцца і змяняюць наша жыццё. Адным з яскравых прыкладаў такога развіцця з'яўляюцца інфармацыйныя тэхналогіі. Са з'яўленнем смартфонаў, планшэтаў і іншых электронных прылад, смарт-прылада стала незаменнай часткай нашага жыцця.

Аднак, калі мы сутыкаемся з такімі новымі тэхналогіямі, узнікае неабходнасць у стварэнні новых тэрмінаў, каб апісаць іх функцыянал і асаблівасці. Адным са спосабаў стварэння такіх тэрмінаў з'яўляецца выкарыстанне складаных слоў, якія складаюцца з двух ці больш элементаў. Часта такое слова пішацца праз злучок, які паказвае на сувязь паміж кампанентамі-словамі. Напрыклад, *смарт-прыладай* можна зваць *смартфон*, планшэт ці камп’ютар. Тут слова *смарт* абазначае інтэлектуальныя функцыі прылады, а слова *прылада* азначае электроннае ўстройства. Такім чынам, сустракаецца выкарыстанне такіх складаных тэрмінаў у ІТ-сферы. Напрыклад, *бэкэнд-распрацоўшчык* – гэта распрацоўшчык, які займаецца стварэннем *бэкэнд-часткі вэб-дадатку* або сайтаў. Тут слова *бэкэнд* абазначае серверную частку дадатку, а слова *распрацоўшчык* указвае на спецыяльнасць чалавека. Але што наконт правапісу гэтых складаных назоўнікаў? Як правільна пісаць словы накшталт *смарт-прылада* і *бэкэнд-распрацоўшчык*?

У выпадку з тэрмінам бэкэнд-распрацоўшчык часцей за ўсё выкарыстоўваюцца два варыянты напісання. Альбо першая частка тэрміна пішацца на англійскай мове, і тады другая – асобна (*beck-end распрацоўшчык*), альбо першая частка транскрыбуецца (у першай частцы гучаць цвёрдыя зычныя, што адлюстроўваецца і на пісьме) і тады паміж дзвюма часткамі складанага слова з’яўляецца злучок (бэкэнд-распрацоўшчык). Адзначаецца варыянт: *beckend-распрацошўчык.* Але ж можна сустрэць і асобнае напісанне абодвух слоў на беларускай мове, што бачыцца парушэннем арфаграфічнай нормы. Што датычыцца тэрміна *смарт-прылада*, тут усё паслядоўна: амаль заўсёды абедзве часткі пішуцца на беларусскай мове і праз злучок. Словы з часткай смарт- выглядаюць больш асвоенымі і сустракаюцца не толькі ў прафесійным маўленні.

Можна сфармуляваць наступныя парады для напісання складаных назоўнікаў. Слова пішацца праз злучок, другая частка з’яўляецца самастойна ўжывальным словам, а таксама першая частка або можа хаця б у гутарковым, нефармальным маўленні быць ужыта самастойна ў якасці назоўніка, або ў постпазіцыі да назоўніка выконваць ролю нескланяльнага прыметніка: *б’юці-блогер*, *вэб-старонка*, *проксі-сервер*, *слім-*

*версія*, *смарт-картка*. Злучковае напісанне слушнае і ў выпадку, калі першая частка неперакладзеная: *USB-порт*, *Windowә-версія*, *WAP-пратакол*, *xDSL-тэхналогія*. Калі першая частка будзе мець у сваім складзе злучок, то другая частка пішацца асобна:*beck-end распрацоўшчык.* Калі другая частка хутчэй толькі нагадае корань складанага слова, але самастойна не ўжываецца, то назіраецца злітнае напісанне: *брэндбук*, *бэкап*, *бэкграўнд*, *паўэрбанк* (у гэтым выпадку другая частка семантычна не супадае з вядомым словам *банк*), *смартфон*. Пытаннем для асобнага даследавання бачыцца правапіс галосных: *фро/антэнд-распрацоўшчык*. Так, фіксуецца напісанне *фронтмен* і *франтмен*, але *ноўтбук*. Відавочна, што правапіс галосных заснаваны на фанетычным прынцыпе, таму больш актыўнае выкарыстанне беларускай мовы (вусна і пісьмова) у тым ліслоку і ў прафесійных зносінах спрыяла б вырашэнніс падобных цяжкасцей.

Незалежна ад напісання складаныя тэрміны з злучком маісць шэраг пераваг. Па-першае, яны дазваляісць нам лёгка апісаць новыя паняцці і тэхналогіі. Па-другое, яны дапамагаісць аблегчыць успрыманне і разуменне тэхнічнай інфармацыі. Па-трэцяе, яны даісць магчымасць ствараць новыя словы і развіваць мову разам з новымі тэхналогіямі.

Варта памятаць, што правілы правапісу могуць змяняцца і адрозніваццa ў розных крыніцах, асабліва калі гаворка ідзе пра новыя і/або спецыяльныя словы. Таму рэкамендуецца звяртацца да афіцыйных, аўтарытэтных крыніц ці даведнікаў, каб быць упэўненым у правільнасці напісання. Стварэнне новых тэрмінаў і развіццё мовы дапамагаісць нам лепш разумець і апісваць змены ў тэхналогіях і ў нашым жыцці.